НОВЫ КУРС МАСТОЎСКАГА ФЛАГМАНА

ААТ «Мастоўдрэў» адзначыла 90-гадовы юбілей

ГІСТАРЫЧНАЯ ДАВЕДКА

Завод у 1927 годзе заснавалі браты Канапацкія. Тады экспарт лесу ў Заходняй Беларусі быў забаронены, і браты наладзілі выпуск фанеры для продажу за мяжу. З цягам часу яны дасягнулі значных поспехаў — фанера мела шырокі попыт у свеце. Былі заказы ад ваеннага ведамства Польшчы — для вырабу вагонаў, самалётаў. Але крызіс 30-х гадоў адбіўся і на рабоце фанернага завода, а падчас Другой сусветнай вайны ён быў амаль поўнасцю разбураны і ўзнавіў сваю дзейнасць толькі ў пачатку 50-х.

Дарэчы, на тэрыторыі завода захаваўся цагляны двухпавярховы будынак дома аднаго з братоў Канапацкіх. Зараз у былым радавым гняздзе размясцілася гасцініца завода, а некалі тут была яшчэ і кантора сплаву, таму што лес тады сплаўляўся па Нёмане.

ХТО КІРУЕ КАРАБЛЁМ

Больш за **11 гадоў прадпрыемства ўзначальвае Сяргей АСОСАЎ,** карэнны мастаўчанін, які прайшоў шлях ад начальніка транспартнага цэха да генеральнага дырэктара. Менавіта з яго прыходам на пасаду кіраўніка завод пачынае аднаўляцца і выходзіць з крызісу. Гэты пад'ём быў важны не толькі для самога прадпрыемства, але і для ўсяго раёна і нават вобласці: 80 % таварнай прадукцыі раёна выпускае менавіта ААТ «Мастоўдрэў».

Сяргей АСОСАЎ, генеральны дырэктар.

Па словах Сяргея Барысавіча, да 2007 года завод амаль што прыйшоў у заняпад і не вытрымліваў ніякай канкурэнцыі. Такая сітуацыя склалася і на шэрагу іншых дрэваперапрацоўчых прадпрыемствах краіны. Было зразумела, што без падтрымкі дзяржавы галіна не зможа развівацца. У гэты час Прэзідэнтам былі прыняты кардынальныя рашэнні — мадэрнізаваць вытворчасць і заняцца ўласнай перапрацоўкай драўніны.

— Лясная сыравіна — галоўнае багацце нашай краіны, і проста гандляваць ёю — можна сказаць, злачынства, — адзначае Сяргей Асосаў.

— Таму быў прыняты ўказ, згодна з якім вядомыя прадпрыемствы галіны атрымалі крэдыты пад гарантыю дзяржавы для пераабсталявання вытворчасці. Праўда, для гэтага спатрэбілася змяніць форму ўласнасці прадпрыемства — большая палова акцый павінна была належаць дзяржаве. І такая стратэгія сябе апраўдала, бо гаворка ішла аб тым, каб засвоіць выпуск імпартазамяшчальнай прадукцыі і самім экспартаваць тавар.

З гэтага часу завод з амаль што стагадовай гісторыяй уступіў у новую эру. Мадэрнізацыя ахапіла ўсю вытворчасць. Работы вяліся ў два этапы. Перш за ўсё было вырашана правесці рэканструкцыю фанернай вытворчасці. Старыя цэхі пайшлі пад знос, а на іх месцы будаваліся новыя, сучасныя карпусы.

— Але нават у такіх экстрэмальных умовах мы не спынялі работу, — удакладняе Сяргей Барысавіч, — людзі працавалі пад адкрытым небам, але ішлі да сваёй мэты. Мы стараліся рабіць рэканструкцыю як мага хутчэй, бо гэта была наша асноўная вытворчасць. Менавіта з гэтага цэха пачалася і гісторыя прадпрыемства 90 гадоў таму.

МОСТ ВЯДЗЕ НА «МАСТОЎДРЭЎ»

Нёман ствараў для прадпрыемства і пэўныя перашкоды. Работнікам, якія жылі ў левабярэжнай частцы горада, прыходзілася дабірацца на працу на пароме альбо на лодках, а зімой — па лёдзе. Гэта было небяспечна. Таму кіраўніцтвам завода ў канцы 60-х гадоў было прынята рашэнне працягнуць падвясны пешаходны мост, які б злучаў два нёманскія берагі. І вось літаральна праз некалькі месяцаў інжынеры завода спраектавалі яго і адправілі на ўзгадненне. Гэта быў складаны перыяд, бо напачатку мясцовыя ўлады не верылі, што ў гэтай справе можна абысціся без сталічных спецыялістаў. Але згода з Мінска была атрымана, сюды пачала прыбываць тэхніка. Вырашылі манціраваць зімой, калі на Нёмане будзе лёд. Зіма ў 1971 годзе выдалася цёплай, прыйшлося чакаць наступнага года, каб вывесці на лёд тэхніку. Праз год, вясной, адбылося адкрыццё незвычайнага моста, які і зараз, — праз 45 гадоў, з'яўляецца самым доўгім у Беларусі пешаходным падвясным мостам.

Трэба сказаць, што яго будаўніцтва праходзіла ў перыяд росквіту прадпрыемства. А самым галоўным прадуктам у той час была фанера. Ад гэтай вытворчасці і пачалася некалі слава мастоўскіх дрэваперапрацоўшчыкаў.

У ШЫРОКІМ ФАРМАЦЕ

Фанерны цэх першым стаў на шлях мадэрнізацыі. Рэканструкцыя вялася пяць гадоў, і ў 2013 годзе быў запушчаны, па сутнасці, новы фанерны завод. Яго магутнасці выраслі, і гэта стала самай высокай аддачай сярод шасці заводаў, якім была аказана дзяржаўная падтрымка.

Замест састарэлага абсталявання на прадпрыемстве «Мастоўдрэў» устаноўлена адзіная ў Беларусі лінія па вытворчасці шырокафарматнай ламініраванай фанеры з плёначным пакрыццём. Па сутнасці, створана вытворчасць, якая не мае аналагаў у краіне, — ніхто больш такую вытворчасць не асвоіў. Зараз тут задзейнічаны новыя сучасныя лініі шліфавання, абрэзкі і сушкі фанеры, прэс для ламініравання. Замянілі агрэгаты па лушчэнні драўніны і ўкладцы шпоны. Выкарыстанне абсталявання вядомых замежных вытворцаў дазволіла «Мастоўдрэву» не толькі павялічыць выпуск прадукцыі, але і павысіць яе якасць. Зараз ламінаваная шырокафарматная фанера адпавядае сусветным стандартам і запатрабаваная не толькі на ўнутраным рынку, але і за мяжой — у Расіі, Турцыі, Азербайджане і іншых краінах.

Анатоль МАХНАЧ, намеснік генеральнага дырэктара па вытворчасці.

У 40 ГРАДУСАЎ НА СУТКІ

Для вытворчасці фанеры патрэбны лісцевыя пароды дрэў, часцей выкарыстоўваецца бяроза. У яе адносна нямнога сучкоў, асаблівы склад гадавых кольцаў і адпаведная шчыльнасць драўніны. Каб надаць сыравіне пластычнасць і неабходную вільготнасць, яе змяшчаюць у праварачны басейн з тэмпературай вады 40 градусаў — менавіта такі рэжым дае найлепшы вынік на выхадзе. Драўніна парыцца суткі, пасля чаго становіцца эластычнай, а шпона з яе не дэфармуецца і захоўвае трываласць.

Працэс атрымання шпоны нечым нагадвае зрэзванне яблычнай скуркі. Такія ж тонкія атрымліваюцца лісты. Затым яны склейваюцца прэсам пад уздзеяннем высокай тэмпературы. Далейшая апрацоўка залежыць ад маркі прадукцыі. Гэта можа быць проста ФК — фанера вадастойкая, ФСФ — фанера буйнафарматная павышанай вадастойкасці і ФОФ — фанера буйнафарматная ламінаваная. Прадукцыя шырока выкарыстоўваецца ў мэблевай вытворчасці, будаўнічых і рамонтных работах, судна- і вагонабудаванні, у вытворчасці экалагічнай тары, для абліцоўкі дамоў і г. д.

Аператарская асноўнай лініі.

Андрэй БУСЛАЎ, начальнік цэха МДФ.

Уладзімір АЛЯХНОВІЧ, вінцелявы гідраўлічнага прэса.

Алена ЛІСАЙ і Вольга ЕЛІСЕЕВА займаюцца зборкай пакетаў фанеры, якія потым адправяць пад прэс.

ДВАНАЦЦАЦЬ АДЦЕННЯЎ ПАДЛОГІ

З 2014 года на прадпрыемстве пачалі выпуск ламінату. Магутнасць лініі складае 4,5 млн квадратных метраў у год. Такім чынам, на заводзе выпускаюць не толькі асобныя кампаненты, але і гатовы прадукт. Мастоўскі ламінат мае 12 адценняў і не саступае па якасці вядучым замежным вытворцам. Ламінаваныя панэлі робяцца на новым нямецкім і італьянскім абсталяванні і адпавядаюць міжнародным нормам. Але зараз гэта поўнасцю айчынны прадукт, які прыносіць у краіну валюту.

— Экспарт — гэта наша значнае дасягненне, — адзначае Сяргей Барысавіч. — З пачатку года атрымалі 9 млн рублёў прыбытку. Праз год у нас з'явіцца чысты прыбытак, зараз гэтыя сродкі ідуць на пагашэнне крэдыту. Але не толькі. Частку сродкаў інвестуем у вытворчасць, працягваем мадэрнізацыю. Напрыклад, у хуткім часе завод правядзе рэканструкцыю лесапільнага дрэваперапрацоўчага цэха. Будуецца новы корпус.

Зараз магутнасці прадпрыемства поўнасцю задзейнічаны. І сапраўды, аб'ёмы ўражваюць. Толькі сыравіны на завод прыбывае штодзень да 40 вагонаў. У суткі перапрацоўваецца 1,5 тыс. кубаметраў драўніны, якая ідзе на вытворчасць фанеры, пліт МДФ і ламінату.

КАБ ПАЗБАВІЦЦА ПЫЛУ

Вытворчасць, звязаная з перапрацоўкай драўніны, не абыходзіцца без такіх пабочных прадуктаў, як пыл. Асабліва гэта датычыцца завода па выпуску пліт. Тут пыл даволі складаны для ачысткі. Але на прадпрыемстве не сталі эканоміць на здароўі персаналу і ахове навакольнага асяроддзя. Пасля доўгіх пошукаў адпаведнага абсталявання спынілі свой выбар на даволі дарагім, але найбольш эфектыўным электрастатычным фільтры Scheuch для сістэмы аспірацыі ачысткі адпрацаваных газаў. На ачыстку паветра ўкладзена 6 млн еўра, на ачыстку вады — 4 млн еўра.

Павел ГАБРУСЕВІЧ, аператар на лініі ламінавання фанеры.

Значныя даты ў «біяграфіі» мастоўскага прадпрыемства

1927 год — заснаванне братамі Канапацкімі фанернага завода.
1945—1953 гады — узнаўленне і рэканструкцыя пасля Вялікай Айчыннай вайны.
1958 год — пераўтварэнне прадпрыемства ў Мастоўскі фанерна-дрэваапрацоўчы камбінат.
1971—1972 гады — пераўтварэнне камбіната ў вытворчае аб'яднанне «Мастоўдрэў», далучэнне мэблевых фабрык і адкрыццё цэха па вытворчасці ДСП.
1972 год — будаўніцтва падвяснога пешаходнага моста цераз Нёман.
1977 год — рэканструкцыя Мастоўскай мэблевай фабрыкі.
1994 год — стварэнне акцыянернага таварыства «Мастоўдрэў».
2007—2015 гады — мадэрнізацыя прадпрыемства, асваенне вытворчасці ламінаванай фанеры, пліт МДФ/ХДФ і ламінату.

ЗАМЕСТ ДСП — МДФ

На пачатку тысячагоддзя паўстала праблема ўдасканалення вытворчасці ДСП. Іх вытворчасць з-за старога абсталявання мела высокі сабекошт і аказалася незапатрабаванай. Таму было вырашана цэх дэмантаваць, а на месцы старых карпусоў пабудаваць новыя, пры гэтым перайсці на выпуск МДФ — драўнянавалакністых пліт сярэдняй шчыльнасці і ХДФ — высокашчыльных драўняных пліт. Вытворчасць ДСП і МДФ хоць і падобная, але мае істотную розніцу. Па-першае, само валакно ў новых плітах значна драбнейшае, па-другое — намнога больш трывалае і экалагічнае.

У той час вытворчасць МДФ пачала распаўсюджвацца ў свеце, і трэба было не спазніцца. У 2015 годзе лініі па выпуску новых пліт уступілі ў дзеянне. Праз два гады новы завод поўнасцю загрузіў магутнасці і зараз працуе па рэальных кантрактах. У сваю чаргу, «Мастоўдрэў» эфектыўна выкарыстоўвае каштоўную сыравіну.

— Стаяла задача выкарыстаць дробнатаварны лес. Драўніну, якая падала і гніла, можна перапрацаваць у лісты і пліты, — растлумачыў Сяргей Асосаў. — Для гэтага патрэбны новыя, сучасныя тэхналогіі. Мы будаваліся, калі на рынку драўніны было адносна ціха. Зараз мы маем найноўшае абсталяванне, якое здольнае канкурыраваць у свеце. Дзякуючы мадэрнізацыі аб'ёмы вытворчасці павялічыліся ў тры разы. Гэта, у сваю чаргу, дазваляе ўдасканальваць умовы працы і павышаць зарплату работнікам. Зараз яна складае ў сярэднім 900 рублёў у месяц.

Біржа сыравіны, куды прыходзіць увесь матэрыял, які потым адпраўляюць па цэхах.

Сэрца горада

Прадпрыемства «Мастоўдрэў» уключана ў турыстычны маршрут горада. Турыстычныя агенцтвы прапануюць яго пад назвай «Сэрца горада». І гэтая назва цалкам адпавядае найбуйнейшаму камбінату рэгіёна. Ён знаходзіцца ў самым цэнтры горада, уздоўж завода праходзіць цэнтральная вуліца, а заводскія карпусы добра відаць з падвяснога моста. Калі ехаць па аўтамабільным месце, позірку адкрываецца шыкоўная індустрыяльная панарама. Жыццё самога прадпрыемства непарыўна звязана з горадам. Тут працуе каля дзвюх тысяч мясцовых жыхароў. Акрамя вытворчай дзейнасці, работнікаў аб'ядноўвае цікавы карпарацыйны адпачынак.

БУДУЧЫНЯ — ЗА КЛАСТАРАМІ

У 2016 годзе Беларусь поўнасцю адмовілася ад продажу за мяжу балансавай, а таксама іншай неапрацаванай драўніны. Пастаўляць на экспарт дазволена толькі прадукты дрэваапрацоўкі з высокай дабаўленай вартасцю. На прадпрыемстве «Мастоўдрэў» дзяржаўны інтарэс падтрымалі. Тут засвоены і мэблевы кірунак. У фанерным цэху вырабляюць каля 30 відаў крэслаў, сталы, а таксама асобныя дэталі для розных відаў мэблі.

На перспектыву ёсць задумка развіваць гэту вытворчасць больш маштабна. Магчыма, тут будзе пабудавана і свая мэблевая фабрыка. Але развіццё дрэваперапрацоўкі пойдзе больш дынамічна, калі вакол завода аб'яднаць вытворцаў мэблі, па-дзяржаўнаму разважае Сяргей Асосаў. У Гродзенскай вобласці нямала кампаній, якія маглі б увайсці ў рэгіянальны мэблевы кластар. Гэта можа даць імпульс для стварэння новых прыватных фірмаў.

— Каля «Мастоўдрэва» павінны развівацца малыя, сярэднія прыватныя прадпрыемствы з далейшай перапрацоўкай, — лічыць генеральны дырэктар, — а мы забяспечым іх фанерай і плітамі. Гэты кірунак — адзін з найбольш эфектыўных спосабаў гаспадарання.

Магчыма, гэта будзе сямейны бізнес, як было раней, і прыклад таму — стварэнне братамі Канапацкімі завода ў Мастах. Невялікія фабрыкі здольныя давесці кожны выраб да бліскучага стану. Масава-паточны спосаб вытворчасці ўжо не такі запатрабаваны.

Імпульсам для развіцця падобнага кластара павінен стаць нядаўна прыняты закон аб лібералізацыі бізнесу. Калі ён будзе працаваць, знойдуцца і тыя, хто зацікавіцца гэтай справай. А выйграюць усе, бо павялічыцца занятасць, загрузяцца пустуючыя плошчы і, нарэшце, пачнуць вяртацца майстры, якія з'ехалі за мяжу ў пошуках заробку.

— Навошта вазіць пліту ў Польшчу, напрыклад, а затым адтуль везці сюды дарагую мэблю? — задаецца пытаннем Сяргей Асосаў. — Тут гэта ўсё трэба развіваць, таму што гандляваць сыравінай — гэта марнатраўства. А дзверы — ужо выраб, ламінат — таксама...

Калі кластар яшчэ ў праекце, то контуры мэблевай вытворчасці завода больш акрэсленыя. Гэта звязана яшчэ і з тым, што прадпрыемства працуе на мяжы сваіх магчымасцяў. І толькі новая вытворчасць дазволіць павялічыць патэнцыял і прыбытак прадпрыемства і ўсяго раёна.

УНП 500126145